Заўтра, 22 красавіка,— дзень памяці У. І. ЛЕНІНА, геніяльнага правадыра працоўных усяго свету


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА • ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 21 КРАСАВІКА 1977 г.

№ 14(1164)

Цана 2 кап.


## ПА БДУ інфармацыя

### У партарганізацыі БДУ

Камуністы універсітэта на сваім чарговым сходзе абмеркавалі пытанне «Аб ходзе выканання пастановы парткома і савета універсітэта аб мерах па далейшаму паляпшэнню ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў». З дакладам выступіў загадчык кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму Л. Яўменаў. У спрэчках прынялі ўдзел Т. Гацукевіч, І. Арэхоўская, Б. Манак, А. Тозік, І. Шаблоўская. Сход прыняў адпаведную пастанову.

### У штабе «КП»

Адбылося чарговае пасяджэнне штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта. На ім разглядаліся пытанні паспяховасці і наведвання заняткаў студэнтамі.

Першым выступіў член штаба «КП», адказны за работу вучэбнага сектара, студэнт гістарычнага факультэта Анатоль Пудаў. Ён расказаў пра работу, якая вядзецца на факультэтах па паляпшэнню вучэбнай дысцыпліны.

У прыватнасці, на гістфаку пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!» праведзен тыдзень паспяховасці, у ходзе якога палепшылася наведванне заняткаў, адбыліся гутаркі з адстаючымі студэнтамі.

На факультэце журналістыкі камісіяй у саставе 7 чалавек зроблены праверкі паспяховасці і наведвання на кожным курсе.

У ліку лепшых адзначан факультэт прыкладной матэматыкі. А вось членам штаба «КП» мехмата трэба лепш наладзіць кантроль за вучэбнай дысцыплінай.

Аб выніках праверкі на біялагічным факультэце расказаў Аляксандр Барэцкі, студэнт III курса юрфака. За гэты навучальны год на факультэце выпушчана 13 нумароў «КП». Тэматыка іх самая разнастайная: аб паспяховасці студэнтаў і наведванні імі заняткаў, аб культуры паводзін, аб рабоце шэфскага сектара, аб харчаванні ў студэнцкай сталовай і іншыя.

Як правіла, рэдакцыя «КП» дабіваецца рэагавання на свае крытычныя сігналы. Але па-ранейшаму застаюцца нявырашанымі пытанні аб дрэннай рабоце ліфта, адсутнасці вентыляцыі ў многіх аўдыторыях.

На пасяджэнні таксама разглядаліся пытанні па паляпшэнню работы універсітэцкага штаба «КП», аб правядзенні агляду-конкурсу насценнага друку, які адбудзецца 5 мая.

Т. БЯЛІЦКАЯ.

## Масква, Крэмль, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС Л. І. БРЭЖНЕВУ

Дарагі Леанід Ільіч!

З пачуццём велізарнай радасці ўспрынялі камсамольцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна паведамленне аб уручэнні Вам камсамольскага білета № 1 і вышэйшай узнагароды Ленінскага камсамола — залатога Ганаровага знака ВЛКСМ.

Ваш жыццёвы шлях з'яўляецца для нас вялікім прыкладам самаадданага служэння Радзіме, партыі, справе будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Мы ўдзячны Вам, дарагі Леанід Ільіч, за бацькоўскі клопат аб моладзі, аб нас—студэнтах. Вашы словы на XXV з'ездзе КПСС аб тым, што заклік гаркаўчан «Ніводнага адстаючага побач!» павінен быць не толькі вытворчым лозунгам, але і маральнай нормай, сталі для нас дэвізам, пад якім вядзецца ўся работа нашай камсамольскай арганізацыі.

Ад імя адзінаццацітысячнай камсамольскай арганізацыі Беларускага універсітэта віншуем Вас, дарагі Леанід Ільіч, з высокай узнагародай камсамола і запэўніваем, што прыкладзём усе намаганні, каб кожны дзень дзесятай пяцігодкі стаў днём выдатнай вучобы, ударнай працы, высокай грамадска-палітычнай актыўнасці.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

## СВЯТА СВАБОДНАЙ ПРАЦЫ





Арганізавана прайшоў на ўсіх факультэтах універсітэта Усесаюзны камуністычны суботнік. Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта добра азнаменавалі гэтае свята — свята свабоднай камуністычнай працы.

Фота М. Чалея.

## ЛІЧЫЦЬ ГАЛОЎНАЙ ЗАДАЧАЙ

З ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА «АБ ПАВЫШЭННІ РОЛІ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У МАРАЛЬНЫМ І ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ».




Камсамольская арганізацыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна вядзе вялікую работу, накіраваную на ўдасканаленне ўсёй сістэмы камуністычнага выхавання студэнцтва, фарміравання ў кожнага члена ВЛКСМ актыўнай жыццёвай пазіцыі, свядомых адносін да грамадскага абавязку, да працы.

Наша праца сёння — гэта вучоба, навукова-даследчая работа, грамадская дзейнасць, студэнцкія будоўлі. 1369 студэнтаў універсітэта з'яўляюцца выдатнікамі, 4194 чалавекі здалі апошнюю сесію на «добра» і «выдатна». У ходзе сацыялістычнага спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!», якое з'яўляецца канкрэтнай формай удзелу студэнтаў у руху за камуністычныя адносіны да працы, павялічылася колькасць акадэмічных груп са стопрацэнтнай паспяховасцю.

З году ў год павялічваецца колькасць студэнтаў, якія займаюцца навукова-даследчай працай. Усё большую ўдзельную вагу ў студэнцкай навуцы займаюць рэальныя даследаванні.

Зараз 93 працэнты камсамольцаў-студэнтаў выконваюць пастаянныя грамадскія даручэнні, актывізавалася шэфская работа камсамольскай арганізацыі, расце колькасць байцоў СБА (1976 г.— 2077 чалавек) і эфектыўнасць вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў, штогод у перыяд летніх і зімовых канікулаў студэнтамі універсітэта для працоўных чытаюцца тысячы лекцый.

Усё большае месца ў дзейнасці камсамола займае арганізацыя і правядзенне Ленінскага заліку, які зарэкамендаваў сябе як эфектыўная форма ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання і самавыхавання членаў ВЛКСМ. Актывізавалася сумесная работа камітэта камсамола універсітэта з кафедрамі грамадскіх навук, у прыватнасці з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і кафедрай марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму па навуковай арганізацыі лекцыйна-прапагандысцкай работы студэнтаў, правядзенню лекторыяў, сустрэч, прысвечаных праблемам маральна-эстэтычнага выхавання.

Камсамольская арганізацыя універсітэта ўстанавіла цесныя кантакты з тэатрамі г. Мінска, шэрагам іншых творчых калектываў. На ўсіх факультэтах універсітэта працуюць калектывы мастацкай самадзейнасці, паспяхова функцыяніруюць 4 агульнауніверсітэцкія калектывы. У агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці прыняло ўдзел каля 1500 чалавек.

Актывізавалася работа камсамольскіх арганізацый па стварэнню клубаў аматараў паэзіі, літаратурны тэатр, школа бальнага танца і некаторыя іншыя.

Разам з тым у шэрагу камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп не створана атмасфера ўзаемадапамогі і патрабавальнасці, таварыскай прынцыповасці. Шэраг камсамольскіх арганізацый фармальна ўдзельнічае ў сацыялістычным спаборніцтве «Ніводнага адстаючага побач!» Вынікам гэтага з'яўляецца тое, што больш 2700 студэнтаў маюць тройкі, 360 займаюцца толькі на «здавальняюча», а 600 студэнтаў штогод атрымліваюць у ходзе сесій нездавальняючыя адзнакі.

Шматлікія камсамольскія арганізацыі слаба ўплываюць на фарміраванне тэматыкі студэнцкіх навуковых даследаванняў, марудна павялічваецца колькасць рэальных даследаванняў, работ, прысвечаных праблемам камуністычнага выхавання моладзі.

У нас больш 700 студэнтаў універсітэта яшчэ не прыцягнуты да актыўнай грамадскай работы. Шэраг грамадскіх даручэнняў носяць неканкрэтны, фармальны характар, іх выкананне не кантралюецца.

Асобныя камсамольскія арганізацыі факультэтаў ухіляюцца ад работы па фарміраванню маральнага клімату студэнцкіх інтэрнатаў, ад барацьбы за стварэнне высокай культуры быту. У інтэрнатах часам адсутнічае атмасфера патрабавальнасці, прынцыповасці ў адносінах да парушальнікаў норм сацыялістычнага супольнага жыцця. Камітэты камсамола, прафсаюзныя арганізацыі, праўленне студэнцкага клуба слаба выкарыстоўваюць магчымасці інтэрнатаў для правядзення розных мерапрыемстваў, стварэння клубаў па інтарэсах.

Універсітэцкі камсамол, арганізуючы работу па маральнаму і эстэтычнаму выхаванню студэнцтва, слаба выкарыстоўвае багатыя магчымасці філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта, філалагічнага і юрыдычнага факультэтаў у арганізацыі лекцыйна-прапагандысцкай работы па пытаннях маральнага і эстэтычнага выхавання, савецкага этыкету, правядзенні сацыялагічных даследаванняў і г. д.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

# На службу вучэбнаму працэсу

**Група народнага кантролю БДУ разгледзела пытанне аб матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні кафедр, навуковых лабараторый і іншых падраздзяленняў універсітэта. ГНК адзначае, што ў цяперашні час у рабоце службы матэрыяльнага забеспячэння універсітэта ёсць асобныя недахопы.**

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне кафедр здзяйсняецца з дзвюх розных крыніц з розным мэтавым прызначэннем — з дзяржбюджэта і сродкаў па гасдагаворах. Гэтыя абставіны прымушаюць весці раздзельна ўлік расходавання сродкаў і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне па дзяржбюджэту і гасдагаворах.

У пытанні расходавання сродкаў па дзяржбюджэту, на наш погляд, рэктарат павінен мець вялікую дапамогу з боку галоўнага інжынера універсітэта, які мог бы вызначаць, якое абсталяванне павінна набывацца кафедрамі ў першую чаргу, а якое можа быць набыта пазней.

Расходаванне сродкаў на абсталяванне і матэрыялы па гасдагаворах здзяйсняецца па ўзгадненню з заказчыкамі пад кантролем прарэктара па навуковай рабоце і начальніка НДА.

Зараз арганізаванае забеспячэнне кафедр абсталяваннем і матэрыяламі праз аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння здзяйсняецца не больш чым на 10—20 працэнтаў. У асноўным набыццё апаратуры і матэрыялаў адбываецца праз загадчыкаў лабараторыямі і іншым вучэбна-дапаможным персаналам па заданнях кафедр шляхам непасрэднага звяртання з гарантыйнымі пісьмамі рэктарата БДУ на заводы, у магазіны і ў іншыя арганізацыі. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне па гасдагаворных НДР адбываецца пры дадатковай аплаце па гасдагаворах (0,5 стаўкі). Такім шляхам кафедрам удаецца хутка атрымаць неабходнае дэфіцытнае абсталяванне, прылады, матэрыялы і інш. Таму на кафедрах маецца па аднаму ці нават некалькі супрацоўнікаў, занятых выключна пытаннямі забеспячэння.

Аднак такі спосаб матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння мае свае недахопы. Кафедры самастойна рыхтуюць гарантыйныя пісьмы, якія з'яўляюцца юрыдычнымі і фінансавымі дакументамі. Вельмі часта гэтыя пісьмы не візіруюцца ў дэканаў факультэтаў і, такім чынам, мінуючы дэканат, паступаюць у рэктарат. Пасля атрымання ў рэктарацэ подпісу пад гарантыйным пісьмом такія пісьмы не рэгіструюцца ў аддзеле матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння універсітэта, у канцылярыі БДУ, што з'яўляецца грубым парушэннем палажэння аб афармленні пісем, якія адпраўляюцца арганізацыямі.

Акрамя гэтага, атрымліваецца вялікая неразбярыха пасля прыбыцця ў адрас БДУ заказанага абсталявання: у матэрыяльна-тэхнічным аддзеле універсітэта не ведаюць, каму яно адрасавана. Аналагічная практыка назіраецца і пры закупцы матэрыялаў і абсталявання па дзяржбюджэту.

На кафедрах ёсць вялікая колькасць прылад і абсталявання, якое не выкарыстоўваецца і не можа быць перададзена іншым кафедрам, бо невядома яго прызначэнне.

У цэлым па універсітэту маецца нявыкарыстанага абсталявання коштам прыкладна на 80 тыс. рублёў. Частку гэтага абсталявання ўжо вырашана спісаць як старое і за непатрэбнасцю (газавых гарэлак на 6 тыс. рублёў, боксы для работы з радыёактыўнымі рэчывамі і інш.). А гэтае ж абсталяванне раней заказвалася як неабходнае.

Зараз на факультэтах няма пасады інжынера па абсталяванню, які займаўся б пытаннямі збору і аналізу заяў на абсталяванне ад кафедр і перадачай іх у аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння БДУ. Акрамя таго, ён павінен займацца пытаннямі выкарыстання, рамонту, праверкі і спісання абсталявання і прылад. Такую пасаду, па думцы дэканаў і аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння БДУ, належала б увесці на факультэтах, дзе маецца асабліва шмат абсталявання (фізічным, радыёфізічным, хімічным, біялагічным).

Аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння не выконвае ў поўнай меры задачы па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню універсітэта і не можа яе выканаць. Гэта тлумачыцца тым, што большасць абсталявання і матэрыялаў набываюцца кафедрамі, мінаючы аддзел МТЗ. Так як у аддзеле ёсць толькі адзін чалавек, які займаецца забеспячэннем абсталяваннем і прыладамі, то ён не можа праяўляць дастатковай аператыўнасці ў атрыманні неабходнага абсталявання, а толькі чакае задавальнення дасланых заяў.

Відаць, пытаннямі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння ў аддзеле павінны займацца некалькі спецыялістаў розных напрамкаў (па фізіцы, хіміі, радыёабсталяванню і інш.). Штатны састаў аддзела з'яўляецца недастатковым і не можа забяспечыць эфектыўнасць работы.

У нас няма дзе захоўваць абсталяванне, рабіць яго агляд. Паступаючае абсталяванне не здаецца на склад, не праходзіць на складзе агляд таваразнаўцы, як гэта трэба па правілах, а адразу ж перадаецца ў нераспакаваным выглядзе кафедрам. Частка абсталявання і матэрыялаў захоўваецца ўвесь год у двары каля корпуса юрыдычнага факультэта.

Даўно ўжо наспела неабходнасць будаўніцтва спецыяльных складскіх памяшканняў для абсталявання і матэрыялаў.

У 1972 годзе ва універсітэце была створана майстэрня па рамонту прылад, якая знаходзіцца ў падначаленні галоўнага інжынера. Ва універсітэце эксплуатуецца больш 20 тысяч адзінак прылад і абсталявання, і колькасць яго пастаянна павялічваецца, таму ўзрастае неабходнасць у рамонце прылад і іх праверцы.

Штогод павелічэнне заяў на рамонт прылад складае 30 працэнтаў, таму майстэрня мае патрэбу ў павелічэнні плошчы хоць бы на 30 квадратных метраў для расшырэння рамонтных майстэрняў.

Як ужо адзначалася, на кафедрах маецца вялікая колькасць нявыкарыстаных прылад. Для эфектыўнага выкарыстання гэтага абсталявання пры рамонтных майстэрнях мэтазгодна арганізаваць бюро пракату, з якога гэтыя прылады маглі б выдавацца на пэўны тэрмін іншым кафедрам, дзе гэтыя прылады маглі б быць выкарыстаны. Бюро пракату магло б рэалізаваць гэтыя прылады праз магазіны «Навука», салон-магазін «Прылады» ці перадаваць іх бязвыплатна школам.

З мэтай ліквідавання недахопаў рэкамендавана падпарадкаваць аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння універсітэта галоўнаму інжынеру БДУ.

Аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння універсітэта павінен быць укамплектаван кваліфікаванымі спецыялістамі (па фізічнаму, хімічнаму абсталяванню, радыёабсталяванню і інш.) з тым, каб ён мог выконваць наступныя задачы: па збору і аналізу ўсіх заявак ад кафедр, па НДА АКБ і інш., накіраванню заяў у адпаведныя арганізацыі і атрыманню ад іх у магчыма больш кароткія тэрміны фондаў на абсталяванне і матэрыялы, атрыманню заказанага матэрыялу і абсталявання ў вызначаныя заказчыкам тэрміны, яго захаванню і перадачы заказчыку, а таксама забеспячэнню універсітэта нефондавым абсталяваннем і матэрыяламі па прамых сувязях з арганізацыямі, праз магазіны, базы і інш.

Рэктарату неабходна ў бліжэйшы тэрмін рашыць пытанне, каму даручыць узначаліць работу па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню кафедр, навуковых лабараторый абсталяваннем, прыладамі, матэрыяламі і аб яго адміністратыўным падпарадкаванні.

Расходаванне рэктаратам і бухгалтэрыяй сродкаў, выдзеленых на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне кафедр і лабараторый універсітэта павінна праводзіцца раўнамерна пакварталььна і на працягу года. У гэтым пытанні рэктарату і бухгалтэрыі павінна быць аказана дапамога з боку службовай асобы, якой будзе даручана работа па арганізацыі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння кафедр абсталяваннем, прыладамі і матэрыяламі.

Кіраўнік матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння універсітэта павінен ведаць, якое абсталяванне неабходна набываць у першую чаргу і якія кафедры маюць патрэбу ў першачарговым забеспячэнні прыладамі і матэрыяламі.

Неабходна ўстанавіць ва універсітэце строгі парадак праходжання і рэгістрацыі гарантыйных пісем і патрабаваць яго няўхільнага выканання кафедрамі і іншымі падраздзяленнямі.

Наспела пытанне аб будаўніцтве спецыяльных складскіх памяшканняў, таму што гэтыя не адпавядаюць патрабаванням, якія прад'яўляюцца да складскіх памяшканняў.

У сувязі з ростам ва універсітэце колькасці выкарыстоўваемых прылад і неабходнасці іх у рамонце паўстала пытанне аб расшырэнні лабараторыі вымяральных прылад і апаратуры і арганізацыі ў ёй рамонту пішучых машынак. Лабараторыя мае патрэбу ва ўкамплектаванні штата кваліфікаванымі інжынерамі і тэхнікамі па рамонту і ў памяшканні для захавання каштоўных прылад і матэрыялаў.

Мэтазгодна арганізаваць пры лабараторыі вымяральных прылад і апаратуры бюро пракату, у якое б маглі быць перададзены кафедрамі ўсе невыкарыстоўваемыя прылады.

**І. ЦІШКЕВІЧ.**
**Л. КІРЫЛА,**
**М. САКАЛОЎ,**
**І. ГАЛАВАТЫ.**

## СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

*Выпуск № 13*

# ЁСЦЬ НАД ЧЫМ ПАДУМАЦЬ

Для нашых студэнтаў праблемы харчавання на першы погляд не існуе. Для іх працуюць сталовыя № 33 і № 34, сталовыя галоўнага корпуса і корпуса хімічнага факультэта, буфеты на філалагічным факультэце, на ваеннай кафедры, у інтэрнатах №№ 2, 3, 6, 7.

Ці так гэта на самай справе? Сектарам быту групы народнага кантролю былі праведзены некалькі рэйдаў-праверак пунктаў грамадскага харчавання.

15 снежня 1976 года камісія ГНК універсітэта пад старшынствам Н. Кавалёва правяла праверку ў студэнцкай сталовай галоўнага корпуса. Члены камісіі выявілі мноства недахопаў, склалі акт і прапанавалі ліквідаваць іх на працягу месяца...

Затым на працягу 4 месяцаў былі арганізаваны яшчэ 2 праверкі: у лютым і сакавіку гэтага года.

З усіх указанняў было выканана адно: зараз на дзвярах галоўнага корпуса вісіць папярэджанне аб тым, што ўваход у верхнім і спецадзенні забаронен.

Але воз і цяпер там: у чарзе стаяла некалькі чалавек у спецадзенні. Як высветлілася, гэта зайшлі паесці студэнты хімічнага факультэта і медінстытута. Звярніце ўвагу: студэнты-хімікі ў спецыяльных белых халатах! А у гэтых халатах яны працуюць у лабараторыях з рознымі хімікатамі, ядавітымі растворамі, кіслотамі. А прама у зале саліднай горкай красаваліся сумкі, паліто, курткі.

Калі ўжо пачалі размову аб санітарных нормах, то скажам яшчэ і аб мыле. У час праверак ва ўмывальніку яго не было. Скажаце, дробязь?

Той, хто часта бывае ў сталовай галоўнага корпуса, напэўна, звярнуў увагу, як рэдка на сталах паяўляюцца салфеткі. Магчыма і гэта дробязь?

Пастаянным наведвальнікам, канешне ж, вядомы і «фірменны» расольнік. Расольнік вядомы не таму, што добры, а таму, што яго больш, чым паўпорцыі, не з'ясі, нават калі і вельмі прагаладаўся. Мяркуючы па смакавых якасцях гэтай стравы, работнікі сталовай па-сапраўднаму не клапоцяцца аб паляпшэнні якасці рыхтуемых страў.

І яшчэ адна практычная парада: калі вы ўбачыце меню, перапоўненае апетытнымі назвамі страў, то заўчасна не радуйцеся іх вялікай колькасці, таму што вельмі часта меню не адпавядае сапраўднасці. Акрамя таго, асартымент страў, пералічаных у меню, не заўсёды супадае з асартыментам страў на раздатачнай лініі. У першую чаргу гэта датычыцца халодных закусак і другіх страў.

Яшчэ 15 снежня загадчыца сталовай дала цвёрдае абяцанне выправіць усе недахопы. Гаварыла яна аб тым, што існуюць аб'ектыўныя прычыны, гаварыла, што востра адчуваецца недахоп у кадрах, і яшчэ аб многім іншым. Але размова ідзе, а справа так і стаіць на месцы. Для студэнтаў па сённяшні дзень рыхтуюць нясмачна. І усе яшчэ спадзяюцца, што прыйдзе такая пара, калі расольнік, прыгатаваны у сталовай, будзе мець дамашні смак.

Мы не сталі падрабязна спыняцца на рабоце усіх універсітэцкіх сталовых і буфетаў, таму што большасць пералічаных недахопаў назіраецца і там. Факты прымушаюць задумацца над праблемай падбору кадраў у сістэме грамадскага харчавання.

Вельмі рэдкія госці у сталовых і буфетах — урачы паліклінікі БДУ. А праверка ж санітарнага стану — гэта іх прамы абавязак. Ці, магчыма, урачы чакаюць, калі паявяцца выпадкі атручвання ежай?

Сур'ёзна належала б падыходзіць да пытанняў грамадскага харчавання і камісіі грамадскага харчавання, камітэту камсамола і прафкому БДУ.

Ёсць над чым падумаць і кіраўніцтву трэста сталовых.

**Н. КАВАЛЁЎ,**
член ГНК БДУ,
**В. БУРДЫКА,**
студэнт III куса журфака.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ, ЯКІМІ ПАВІННЫ ЗАЙМАЦЦА ГРУПЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

**І. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ.**

Выкананне дырэктыў партыі і ўрада аб вышэйшай школе (у дастасаванні да якога-небудзь канкрэтнага пытання).

Разгляд заяў, прапаноў і скаргаў.

Прытрымліванне правілаў распарадку дня ва універсітэце і інтэрнатах.

**ІІ. ВУЧЭБНА-ВЫТВОРЧАЯ РАБОТА.**

Прытрымліванне правілаў правядзення ўступных экзаменаў і залічэння на першы курс.

Прытрымліванне Палажэння аб курсавых экзаменах і заліках, а таксама пераводу студэнтаў на старэйшыя курсы з адной навучальнай установы ў другую.

Правільнасць і даставернасць уліковых і справаздачных даных па паспяховасці і вучэбнай рабоце.

Правільнасць вызначэння аб'ёму тыднёвай вучэбнай нагрузкі студэнтаў.

Правільнасць размеркавання педагагічнай нагрузкі прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Правільнасць размеркавання і выкарыстання лабаранцкага саставу і абслугоўваючага персаналу.

Арганізацыя вучэбнага працэсу на вячэрнім і завочным аддзяленнях.

Выкананне плана павышэння навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў.

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу.

Правільнасць і мэтазгоднасць выкарыстання абсталявання.

Стан захавання, уліку і расходавання дарагакаштуючых матэрыялаў, хімрэактываў, фотаматэрыялаў на кафедрах і ў лабараторыях.

Прытрымліванне ўстаноўленага парадку аплаты работы прафесарска-выкладчыцкага саставу (штатнага і пагадзіннага).

**ІІІ. НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА.**

Актуальнасць тэматыкі навукова-даследчых работ.

Кантроль за станам і тэрмінам выканання навукова-даследчых работ па дзяржбюджэтнай і гасдагаворнай тэматыцы.

Забяспечанасць навукова-даследчых работ абсталяваннем і матэрыяламі.

Праверка правільнасці аплаты працы работнікаў, выконваючых гасдагаворныя работы.

Рэзультатыўнасць навукова-даследчых работ. Укараненне рэзультатаў навуковых даследаванняў у вытворчасць.

Размеркаванне і выкарыстанне фінансавых асігнаванняў на выкананне навуковых работ.

Здзяйсненне кафедрамі кіраўніцтва навукова-даследчай работай студэнтаў.

**IV. АДМІНІСТРАТЫЎНА-ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ.**

Гатоўнасць вучэбных карпусоў і інтэрнатаў да пачатку навучальнага года.

Выкананне планаў будаўніцтва і рамонту вучэбных карпусоў, інтэрнатаў.

Прытрымліванне штатна-фінансавай дысцыпліны.

Правільнасць і мэтазгоднасць выкарыстання абсталявання і электраэнергіі ў вучэбных карпусах, на кафедрах і ў лабараторыях.

Стан уліку, захавання і выкарыстання кніжнага фонду ў бібліятэках універсітэта і на кафедрах.

Забяспечанасць студэнтаў, асабліва завочнікаў і вячэрнікаў, вучэбнай і метадычнай літаратурай.

Культурна-бытавое абслугоўванне супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта (работа буфетаў, сталовых, гардэробаў, медпункта і г. д.).

Стан складской гаспадаркі і расходаванне матэрыяльных каштоўнасцей.

Правільнасць размеркавання месц у інтэрнатах.

Кантроль за выкарыстаннем стыпендыяльнага фонду.

**ГРУПА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

# ЛІЧЫЦЬ ГАЛОЎНАЙ ЗАДАЧАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Кіруючыся рашэннямі XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, XVII з'езда ВЛКСМ па пытаннях маральнага і эстэтычнага выхавання, накіроўваючы свае сілы на дастойную сустрэчу 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, пленум камітэта камсамола універсітэта пастанавіў лічыць асноўнай задачай камсамольскай арганізацыі універсітэта фарміраванне ў студэнтаў камуністычных маральных норм, прынцыпаў і ідэалаў, выхаванне ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, свядомых адносін да свайго грамадскага абавязку, аддансці справе камунізму, любві да сацыялістычнай Радзімы, краін сацыялізму, сцвярджэнне пачуцця сацыялістычнага інтэрнацыяналізму і савецкага патрыятызму.

Камсамольскім арганізацыям факультэтаў неабходна павысіць эфектыўнасць сацыялістычнага спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!», дабіцца стварэння ў кожнай групе станоўчага маральнага клімату, высокай патрабавальнасці, таварыскай прынцыповасці. У такіх умовах з найбольшай паўнатой праяўляецца імкненне кожнага ісці ў нагу з усімі.

Пленум лічыць важным узмацніць уплыў камсамольскіх арганізацый на фарміраванне тэматыкі навуковых студэнцкіх даследаванняў, на гуманітарных факультэтах павялічыць колькасць даследаванняў па праблемах камуністычнага выхавання моладзі, вынікі даследаванняў укараняць у дзейнасць камсамольскіх арганізацый універсітэта, рэкамендаваць для выкарыстання ў рабоце гарадской камсамольскай арганізацыі.

Камсамольскія арганізацыі акадэмічных груп, факультэтаў павінны звярнуць сур'ёзную ўвагу на павышэнне якасці правядзення Ленінскага заліку.

Выкарыстоўваючы магчымасці калектыўных даручэнняў шэфскай, агітацыйна-прапагандысцкай работы, трэба прыцягнуць усіх студэнтаў да актыўнай грамадскай дзейнасці.

Намечана сумесна з кафедрай марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму да 1 мая 1977 г. закончыць распрацоўку сістэмы маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў, распрацаваць тэматыку студэнцкіх навуковых даследаванняў па праблемах маральнага і эстэтычнага выхавання студэнцкай моладзі, правесці ў першым семестры 1977-78 навучальнага года навукова-практычную канферэнцыю «Актуальныя праблемы маральнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў».

З мэтай павышэння эфектыўнасці работы камсамольскіх арганізацый сумесна з кафедрамі марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў вырашана стварыць на базе аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта студэнцкую сацыялагічную лабараторыю.

Сумесна з таварыствам «Веды» універсітэта і кафедрай этыкі, эстэтыкі і навуковага камунізму будзе арганізаван, пачынаючы з 1977-78 навучальнага года, пастаянна дзейнічаючы лекторый для студэнтаў «Савецкі лад жыцця, этыкет і культура».

З мэтай паляпшэння эстэтычнага выхавання студэнтаў рэкамендавана камітэтам камсамола факультэтаў шырэй практыкаваць заключэнне дагавораў аб супрацоўніцтве з творчымі калектывамі г. Мінска.

Ідэалагічнаму аддзелу камітэта камсамола універсітэта да 15 мая падрыхтаваць і ўнесці ў рэктарат прапановы па стварэнню студэнцкага кафэ.

З мэтай стварэння новых, пастаянна дзейнічаючых калектываў мастацкай самадзейнасці на факультэтах і павышэння эфектыўнасці дзейнасці існуючых, для прыцягнення вялікай колькасці студэнтаў да ўдзелу ў мастацкай самадзейнасці, развіцця такіх форм мастацкай творчасці, як агітбрыгады, студэнцкія тэатры мініяцюр і г. д., лічыць мэтазгодным перагледзець існуючую сістэму аглядаў мастацкай самадзейнасці.

# НА ПРЫСТУПКАХ НАВУКІ

Штогод з мэтай прыцягнення студэнтаў да вучэбна-навуковай працы ва універсітэце праводзяцца навуковыя канферэнцыі. Яны садзейнічаюць фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду, развіццю самастойных даследаванняў і пошукаў, творчых здольнасцей студэнтаў.




Актыўна ўключылася ў работу навуковай канферэнцыі і кафедра біяфізікі. Расказвае кіраўнік студэнцкага гуртка біяфізікі аспірант **І. Гуліс:**

— Наша асноўная задача — знайсці, захапіць, зацікавіць. Да нас ідуць здольныя, шукаючыя, нястомныя. Мы павінны падрыхтаваць трывалы рэзерв даследчыкаў, навуковых супрацоўнікаў кафедры.

**— Некалькі слоў аб вашым гуртку і аб тым, як праходзіла канферэнцыя.**

— Гурток біяфізікі існуе каля чатырох гадоў. Студэнты займаюцца з ахвотай. Працуем над рознабаковымі і цікавымі праблемамі. На днях былі праведзены два пасяджэнні, на якіх заслухана і абмеркавана 19 выступленняў. Трэба адзначыць прыемную асаблівасць — заняткі, як ніколі, былі ажыўленыя, мнагалюдныя, даклады змястоўныя і паглыбленыя.

**— Раскажыце, калі ласка, аб лепшых з іх.**

— Трэба адзначыць навуковую працу студэнта III курса П. Дулько. Ён працаваў над тэмай «Эфект Карліян. Сучасны стан праблемы» (кіраўнік — дацэнт І. Чаранкевіч). Вельмі глыбока, перакануча быў распрацаван матэрыял. Асаблівую цікавасць аўдыторыі выклікаў даклад студэнткі V курса Т. Казловай, які пазнаёміў прысутных з новым метадам для прыжывання почкі. Яе праца мае практычнае значэнне.

**— Якая праблема хвалюе вас зараз?**

— Мы займаемся распрацоўкай новых метадаў захоўвання гародніны і садавіны пры дапамозе ўздзеяння іёнаў паветра і азону на прадукты. Гэтае пытанне паклаў у аснову сваёй навуковай працы студэнт V курса А. Някрасаў.

**— Вынікі вашай канферэнцыі?**

— На мой погляд, самыя станоўчыя. Па-першае, шматгранны і шматбаковы ахоп навуковых праблем. Па-другое, значна павялічылася колькасць удзельнікаў пасяджэнняў. 11 навуковых работ вылучылі на агульнауніверсітэцкую канферэнцыю. Многім студэнтам былі вынесены падзякі, работы В. Зорына і Т. Казловай адзначаны граматамі.

**— Магчыма, у вашай рабоце ёсць недапрацоўкі, цяжкасці. Што б вы хацелі б паправіць?**

— Гуртку трэба больш увагі ўдзяліць расшырэнню кантакту са студэнтамі малодшых курсаў. Прыцягнуць да навуковай працы студэнтаў II курса.

Інтэрв'ю правялі
**М. ЗУБЕЛЬ,**
**Л. ДРАЗДОВА.**

# ДЗЕНЬ ХІМІКА

**Традыцыйным стала гэтае свята на хімфаку БДУ. А сёлета святкавалі юбілей — пяць гадоў. Гасцей з Масквы, Адэсы і Вільнюса, Алма-Аты і Тбілісі сустракалі напярэдадні гэтага дня. Многае змянілася, але засталіся такімі ж вясёлымі, дружалюбнымі і гасціннымі сённяшнія студэнты. Вось што гаворыць Г. Ханін, выпускнік Ленінградскага універсітэта, які чацвёрты раз прыязджае дэлегатам у Мінск.**

**— Дні хіміка сталі часткай майго жыцця. Сапраўднае студэнцкае свята, да якога мы доўга рыхтуемся. У 1973 г. нарадзілася добрая задума. Першы раз мы ехалі толькі ў госці, другі раз — да сяброў, а сёння прыехалі дадому.**

**Многа добрых слоў можна было пачуць у гэты дзень ад гасцей. Гаркаўчане, ленінградцы, кубанцы, наогул, усе дэлегацыі прыехалі з добра падрыхтаванай праграмай сваіх выступленняў. Са сцэны амаль у кожным нумары адчувалася тое агульнае, што аб'ядноўвала гэтых няўрымслівых юнакоў і дзяўчат.**

**— Як вы ацэньваеце сваю паездку, самыя моцныя ўражанні гэтых дзён? — звярнуўся я да адэсітаў і краснадарцаў.**

**Вова Шварц, студэнт-дыпломнік Адэскага універсітэта:**

**— Шкадую, што упершыню прыехаў сюды, але думаю — не апошні раз. І яшчэ: выдатныя рабяты ў вас на хімфаку.**

**Люда Міхейкіна, першакурсніца з Краснадара:**

**— Запомнілася ўсё. Дабрата і сардэчнасць, мінчане і Мінск.**



**Пасля нашага 30-градуснага марозу сталіца вашай рэспублікі здавалася нам сонечнай Малдавіяй.**

**Госці пабывалі на экскурсіі ў Хатыні, наведалі Курган Славы.**

**М. БАЖКО.**
**Фота аўтара.**



# РУХААЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ І ЗДАРОЎЕ

(Працяг. Пачатак у №№ 9, 10, 13).

Хадзьба і бег з'яўляюцца аднымі з лепшых натуральных спосабаў фізічнай нагрузкі. Неабходнасць іх як сродку прафілактыкі і лячэння падкрэслівалі яшчэ прадстаўнікі старажытнагрэчаскай медыцыны Фессал, Асклепіад, Гіпакрат і іншыя. Арыстоцель стварыў нават школу «перыпатэтыкаў», г. з. гуляючых, у якой навучанне вялося ў час прагулак.

Для людзей студэнцкага і сярэдняга ўзросту рэкамендуецца хадзіць пешшу штодзённа 9—10 км. Амерыканскі аўтар прафесар К. Купер распрацаваў канкрэтныя ўказанні па хуткасці трэніровачнай хадзьбы. Так, для мужчын да 30 гадоў ён раіць на 1-м тыдні прайсці дыстанцыю 1,6 км за 15 мін., на 6-м тыдні—дыстанцыю 2,6 км за 20 мін. 30 сек. Людзям 40—42 год на 1-м тыдні К. Купер рэкамендуе 1,6 км прайсці за 18 мін. На 14-м тыдні дыстанцыя 4,8 км павінна быць пройдзена за 42 мін. 45 сек.

Асаблівую папулярнасць як эфектыўны сродак умацавання здароўя набыў у апошнія гады аздараўленчы бег. Бег у спакойным тэмпе ўмацоўвае нервовую, сардэчна-сасудзістую і дыхальную сістэмы арганізма, перашкаджае адкладванню халестырыну на сценках крованосных сасудаў, умацоўвае мышцы, паляпшае функцыянальны стан печані, удасканальвае функцыі астатніх унутраных органаў. Пры рэгулярных занятках бегам рэзка скарачаецца колькасць прастудных захворванняў.

Пачынаць трэніроўку ў бегу належыць (абавязкова пасля папярэдняй кансультацыі з урачом) з паскоранай хадзьбы, чаргуючы яе з невялікімі прабежкамі. Пры паяўленні цяжкаватага дыхання тут жа трэба паменшыць хуткасць ці перайсці на хадзьбу.

Прыкладная хуткасць бегу для людзей да 30 год: на 1-м тыдні трэніроўкі 1,6 км прабягаць за 13 мін. 30 сек., на 2-м тыдні—за 13 мін. 30 сек., на 3-м тыдні—за 13 мін., на 6-м тыдні —за 10 мін. 30 сек., на 15-м тыдні—ужо за 7 мін. 45 сек.

Для людзей больш старэйшага ўзросту на першых трэніроўках рэкамендуецца дыстанцыю 2600—2800 м пераадольваць прыблізна ў такой паслядоўнасці: 100 м хадзьба+50 м бег. Усяго неабходна выканаць 4—5 такіх прабежак, астатняя дыстанцыя праходзіцца пешай хадой. Да 11—12 заняткаў дыстанцыя 3800 м пераадольваецца таксама ў спалучэнні хадзьбы з бегам. Аднак бегавыя адрэзкі складаюць ужо 200—300 м спакойнага раўнамернага бегу. Чыста бегавая трэніроўка пачынаецца з дыстанцыі 600—800 м. Час бегу пастулова даводзіцца да 20—25 мін., хуткасць —6—7 мін. на кіламетр.

Заняткі бегам праводзяцца 4—6 разоў у тыдзень. Перад трэніроўкай пажадана зрабіць невялікі комплекс гімнастычных практыкаванняў.

Пазаймаўшыся бегам некалькі месяцаў, вы адчуеце сябе лепш, заўважыце павышэнне працаздольнасці. Час, патрачаны на трэніроўкі, у сто разоў акупляецца. Фізічныя практыкаванні стануць нязменным спадарожнікам вашага жыцця.

**У. РЭЙЗІН,**
**кандыдат педагагічных навук, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**

КАЛОНКА З ПРАЦЯГАМ

# З В А Р О Т

## ДА ЎСІХ СТУДЭНТАЎ І ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА САСТАВУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

У нашай краіне паспяхова развіваецца медыцынская навука і практыка, дзякуючы чаму расце працягласць жыцця, памяншаецца агульная і дзіцячая смяротнасць. Стварэнне новых актыўных прэпаратаў крыві накіраванага дзеяння, укараненне ў практыку хірургіі і рэаніматалогіі метаду штучнага кровазвароту, распрацаванага савецкімі вучонымі, стала магчымым дзякуючы пераліванню крыві і паспяховаму развіццю донарства.

Цэнтральнай праблемай у гэтым з'яўляецца донарства. Патрэба ў донарскай крыві ў нашы дні велізарная.

У 1976 годзе далі сваю кроў для лячэння хворых больш 8 млн. бязвыплатных донараў, з іх 1200 чалавек—студэнты і супрацоўнікі нашага універсітэта.

Калектыў БДУ імя У. І. Леніна ў лютым 1977 года здаў 60 літраў крыві.

Пярвічная арганізацыя таварыства Чырвонага Крыжа, камітэт камсамола і прафком звяртаюцца да ўсіх студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна падтрымаць патрыятычны рух — бязвыплатнае донарства і адзін раз у год даць сваю кроў для лячэбных мэт.

**КАМІТЭТ ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ.**



# Ружовы ранак

літаратурная старонка



# ПАХ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

У наш час свет, які адкрываецца перад чалавекам, становіцца ўсё больш шырэйшым. І вельмі важна ў гэтым свеце не страціць арганічнай сувязі з роднай зямлёй.

...Памяць зноў і зноў вяртае да родных мясцін, нараджае пачуццё такой паўнаты жыцця, калі радасць быцця пераходзіць цераз край:

На родину, в село
позвал средь ночи
меня тревожный клекот
журавлей.
Туда, где над просторами
полей
Гроза
громами юными грохочет.

Гэта верш з кнігі **Міколы Федзюковіча «Птичье дерево» (М., «Молодая гвардия», 1976 г.)** У яе ўвайшлі творы двух зборнікаў, выдадзеных раней у Беларусі.

М. Федзюковіч не перастае звяртацца да роднай зямлі — яна дае яму сілу, жывіць яго паэзію жыватворнымі сокамі. З парога роднай хаты адкрываецца позірку аўтара вялікі свет. У гэтым свеце знаходзіцца месца пачуццям і перажыванням паэта, звязаным з родным краем. Ён прадстае вобразам маці, самым дарагім для паэта чалавекам. Шчырая цеплыня гучыць у гэтых радках. Але чуецца ў іх і папрок самому сабе, нават боль.

Аўтар «Птичьего дерева» лічыць, што сыноўняя адданасць роднаму дому — пачатак усяго. Ён шчыра верыць:

...коль дорог нам родной
очаг,
нас
трехступеньчатое наше небо
держать
надежно
будет
на плечах!

Аўтар параўноўвае нашу Зямлю з зорным караблём. З горыччу паэт шкадуе: «Как жаль, что места в нем не всем хватило». Сказана зусім проста, але мы ўжо душой адчуваем неабыякавасць аўтара не толькі да лёсу нашай краіны, але і да лёсу ўсёй планеты.

Каб заслужыць давер'е чытача, права на ўвагу, Федзюковіч стараецца ўвесці яго ў свой унутраны свет. Частыя падарожжы ў краіну дзяцінства. Але заўважце: «сад дзяцінства» ў Міколы Федзюковіча асірацелы. Гэта таму, што ў памяць паэта ўрэзаліся гады суровай пары, якая стала выпрабаваннем для ўсяго нашага народа.

Паэт не можа забыць, як у астуджанай хаце паміраў дзядзька Іван. Страшная карціна апісана ў вершы «Баллада об аистах»: уцалеўшыя ад пагібелі белыя птушкі кружацца над папялішчам гняздоўя.

У вершы маладога аўтара ўсё больш уваходзіць пачуццё дачынення да гісторыі. Яно нараджае многія пранікнёныя радкі кнігі.

«Птичье дерева» — гэта першая сустрэча Міколы Федзюковіча з усесаюзным чытачом. Трэба спадзявацца, што яна будзе цікавай і плённай. Аўтар трывала зацвердзіў сябе ў свеце знаходак, у свеце, які ён стварае і бачыць сам.

**Т. ГАЎРУСЁВА,**
**студэнтка II курса факультэта журналістыкі.**

**В. БАРЫСЕВІЧ**

## НОВЫ ДЗЕНЬ

**Ранак, вясновы ранак**
**Новы струменіць дзень.**
**За бялізной фіранак**
**Ветрык пчалой гудзе.**
**Цёплым праменнем сонца**
**П'е халадок расы**
**З лёгкіх стракатых донцаў**
**Кветак—зямной красы.**
**Новы працоўны будзень**
**Лье над зямлёю свет.**
**...Шчасце — калі ты людзям**
**Добры пакінеш след.**

**В. СТРЫЖАК**

* * *

Узляцела гэтак міла
Рук пяшчотнае ласо...
Зноў мяне ты затапіла
Поймай русых валасоў.

За дзвярыма ноч залегла,
Млее цесная павець.
Пачуцця твайго залева
За фіранкамі павек.

У тваіх цалунках вязне
Голас мой і чэзне дых...
Ці ж навечна я твой вязень?
Ці ж мая навечна ты?

**У. МАЗГО**

## СЛОВЫ

Зноўку
Белай замеццю
Хвалюе сад вішнёвы...
У незабыўнай памяці
Твае ўваскрэслі словы,
Што з губ тваіх,
Дрыготкія,
Ліліся, як прычасце,
Калі світальнай лодкаю
Веславала шчасце...

**Т. ПОЛЕТАЕВА**

* * *

**Как река блистала в лесу,**
**Как шуршала и как урчала!**
**Я решила: с собой унесу.**
**Зачерпнула горсть и помчалась.**

**О, как ноша моя легка!**
**Вот уж душный поселок виден.**
**Я кричала друзьям: «Смотрите,**
**У меня на ладонях река!**
**Как живая она шуршит...»**
**И они, побросав игрушки,**
**Обступили: «Ну, покажи!»**
**Я разжала ладони.**
**«Врушка!» —**
**Кто-то громко выкрикнул.**
**«Нет!!!»—**
**Я кричала, познавши боль,**

**И смеялась река в ответ:**
**«Говоришь, унесу с собой!..»**



Гэтыя здымкі зроблены на ўрачыстым вечары, прысвечаным 7-годдзю з дня стварэння факультэта прыкладной матэматыкі.
За сем год свайго існавання ФПМ даў пуцёўку ў жыццё многім юнакам і дзяўчатам. Зараз на факультэце займаецца звыш 1200 студэнтаў.
НА ЗДЫМКАХ: гучыць песня пад гітару; выступае тэатр мініяцюр.
Фота М. Чалея.

# СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМІ

Гаворачы пра родную літаратуру, мы адным з першых звычайна называем імя народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна. Творы яго, як сказаў Андрэй Макаёнак, «вельмі блізкія і дарагія нам, бо глыбока і займальна адлюстроўваюць праўду жыцця. Цудоўны мастак слова ўзбагаціў нашу літаратуру».

Нядаўна ва універсітэце адбылася канферэнцыя чытачоў па аповесцях І. Шамякіна «Гандлярка і паэт» і «Шлюбная ноч», на якой прысутнічалі сябры пісьменніка, крытыкі і літаратуразнаўцы, журналісты, выкладчыкі і студэнты БДУ. Цёплыя словы ўдзячнасці аўтару выказалі пісьменнікі Андрэй Макаёнак, Аркадзь Марціновіч, Віктар Дайліда, крытыкі Дзмітрый Бугаёў, Віктар Каваленка, Галіна Егарэнкава, студэнты Алесь Шыбут, Леанід Дарафеў і многія іншыя.

У канцы сустрэчы выступіў Іван Шамякін. Ён падзяліўся сваімі планамі на будучае, адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

**М. ДУБОВІК,**
**М. ФЕДАРЭНКА,**
слухачы падрыхтоўчага аддзялення.

# «ШТО Ў ІМЕНІ ТАБЕ МАІМ?»

Ініцыятыва кафедры сучаснай рускай мовы аб правядзенні тэматычных вечароў у студэнцкім інтэрнаце знайшла гарачую падтрымку на іншых кафедрах філалагічнага факультэта. Адзін з такіх вечароў у сакавіку правялі члены кафедры рускай класічнай літаратуры Н. Галаўко, Л. Кароткая, В. Караушкіна, А. Станюта, А. Лемешаў.

У ленінскім пакоі інтэрната № 4 сабраліся студэнты—аматары вершаў геніяльнага рускага паэта, і загучала неўміручая пушкінская паэзія.

Назву вечара выбралі аднагалосна — «Што ў імені табе маім?». З успамінаў сучаснікаў А. С. Пушкіна склалі мемуарную біяграфію паэта.

Гучалі ўспаміны Керн, Юзафовіча. Прачытаць Пушкіна памайстэрску, так, каб паэзія яго не страціла сваёй жывасці, натхнення, канкрэтнасці, дапамаглі нам нашы выкладчыкі.

Віктарына, якую паспяхова правялі Л. Кавалёва і В. Анапін, з'явілася своеасаблівай праверкай глыбіні і трываласці нашага ведання творчасці Пушкіна. Пераможцы віктарыны Людзе Граковіч дастаецца галоўны прыз —кніга прафесара кафедры рускай класічнай літаратуры Ф. І. Куляшова з аўтографам аўтара.

**Я. ВІНАГРАДАВА,**
**студэнтка філфака.**

# ПЕСНІ РАДЗІМЕ

«Людзі добрыя, памятайце: мы любім жыццё, і Радзіму нашу, і вас, дарагія. Наша просьба да ўсіх: няхай смутак і журба ператворацца ў мужнасць і сілу, каб змаглі ўвекавечыць вы мір і спакой на Зямлі. Каб нідзе і ніколі ў віхуры пажараў жыццё не ўмірала!» — гэта зварот спаленых у Хатыні да жывых...

Аўтары надпісаў у Хатыні — Ніл Гілевіч і Пятрусь Броўка.

Як усё здзіўляюча пераплятаецца ў жыцці! Ніл Гілевіч добра памятае той сакавіцкі дзень 1943 года, калі яго аднавяскоўцы, гледзячы на чорны дым, які ўздымаўся за лесам, з трывогай думалі: «Што гэта гарыць?» Гэта гарэла Хатынь, якая знаходзіцца ў 10 кіламетрах ад роднай вёскі паэта...

Незвычайнай сілай гучаць пранікнёныя радкі паэта ў яго паэме «Сто вузлоў памяці», у араторыі з чатырох балад «Гарыць, гарыць мая Лагойшчына», у зборніках вершаў «Песня ў дарогу», «Галубіная крыніца», «Актавы». Гэта рана сэрца, якая не загойваецца, гэта страсны заклік да міру, дабра, святла.

Творчасць паэта характарызуецца незвычайнай рознабаковасцю. У дзяцінстве мы чыталі яго вершы ў кнігах «Зялёны востраў», «Дождж-грыбасей», любілі яго «Загадкі». Пазней мы адкрылі для сябе новага Гілевіча: палымянага барацьбіта за мір, патрыёта Радзімы, які сваім паэтычным талентам змагаецца з перажыткамі мінулага.

Кожны зборнік паэта дапамагае пагледзець на, здавалася б, даўно вядомую з'яву па-новаму, адчуць сваю прыналежнасць да ўсяго навокал, а, значыць, і неабходнасць заўсёды і ўсюды змагацца супраць коснага, аджываючага. Сатырычныя творы Н. Гілевіча вызначаюцца высокай грамадзянскасцю, непрымірымасцю да мяшчанства, бюракратызму, драпежніцтва. На мой погляд, гэта найлепшае з яго лірыкі.

Творчасць Н. Гілевіча сваімі каранямі ўходзіць у беларускі фальклор. Гэта вынік глыбокага вывучэння паэтам невычарпальных багаццяў народнай мудрасці. Ніл Гілевіч—кандыдат філалагічных навук, яго даследаванні беларускага фальклору (кнігі «Наша родная песня», «Народныя песняры», «Паэтыка беларускай народнай лірыкі», «Народныя загадкі» і іншыя) атрымалі высокую ацэнку літаратуразнаўцаў.

Акрамя таго, Н. Гілевіч—таленавіты перакладчык. За шматлікія высокамастацкія пераклады з балгарскай мовы ўрад Балгарскай Народнай Рэспублікі ўзнагародзіў яго ордэнам Кірылы і Мяфодзія І ступені.

Усё гэта расказалі шматлікім паклоннікам паэзіі, чытачам твораў вядомага беларускага паэта Н. Гілевіча сакратар СП БССР І. Чыгрынаў, пісьменнікі В. Вітка, Я. Сіпакоў на аўтарскім вечары Ніла Гілевіча, які адбыўся ў пачатку красавіка ў мінскім Доме літаратара.

З вялікай цеплынёй сустрэлі прысутныя выступленне самога паэта, які прачытаў новыя творы.

Гэты вечар—першы з цыкла творчых справаздач беларускіх пісьменнікаў, прысвечаных 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

**Т. ПАРАХНЕВІЧ.**

**В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ.**

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.